Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Помнік
# рускай славы

## *лёс галоўнага помніка горада*

***Да 105-годдзя з часу ўсталявання помніка ў гонар***
***першай перамогі ў 1812 годзе,***
***Да 205-годдзя Кобрынскага бою 1812 года***

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне

Кобрын
2017

ББК 91.9:79(4Беи)
П55

***Складальнік***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

П55 **Помнік рускай славы: лёс галоўнага помніка горада** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 105-годдзя з часу ўсталявання помніка ў гонар першай перамогі ў 1812 годзе, 205-годдзя Кобрынскага бою 1812 года / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2017. – 24 с. : іл.

**ББК 91.9:79(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2017

# ПРАДМОВА

Для горада Кобрына помнік першай перамогі рускіх войскаў 1812 года стаў своеасаблівай візітнай карткай. Не толькі ў юбілейны год 200-годдзя вайны, але і раней на турыстычных брашурах і буклетах нароўні з гербам горада і бюстам А. В. Суворава ўвесь час прысутнічала фатаграфія гэтага манументальнага помніка, які з'яўляецца адным з самых наведвальных у горадзе і раёне аб'ектаў.

Жыхары Кобрына лічаць яго чымсьці непарушным і ўсім наведвальнікам горада расказваюць пра складаны лёс гэтага манумента, які падзяліў усе перыпетыі той гісторыі.

Бібліяграфічны паказальнік «*Помнік рускай славы: лёс галоўнага помніка горада*» выдаецца напярэдадні 105-годдзя з часу ўсталявання помніка ў гонар першай перамогі ў 1812 годзе, 205-годдзя Кобрынскага бою 1812 года.

Уключае гістарычную даведку пра манумент і спіс крыніц. Творы друку згрупаваны па відах: кнігі, раздзелы з кніг, часопісныя і газетныя артыкулы. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне адрасавана экскурсаводам, турыстам, бібліятэчным работнікам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

# ДВАНАЦЦАТЫ ПАМЯТНЫ ГОД
## Кобрынскі бой

*Раздайтесь, напевы победы,*
*Пусть русское сердце вздрогнет!*
*Припомним, как билися деды*
*В двенадцатый памятный год.*



У вялікай гісторыі Кобрыншчыны ёсць шмат звестак аб ваенных падзеях, якія адбываліся на яе тэрыторыі.

Значная частка ваенных падзей Айчыннай вайны 1812 года адбывалася на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У чарадзе населеных пунктаў, адзначаных буйнымі баямі ў гэты час, ярка вылучаецца горад Кобрын, які стаў знакавым месцам для рускага войска, апынуўся ў эпіцэнтры баявых дзеянняў.

15 ліпеня 1812 года адбыўся бой паміж часцямі 3-й рускай арміі генерала А. П. Тармасава і атрадам генерала Кленгеля, які ўваходзіў у пяты корпус арміі Напалеона.



Выконваючы загад выступіць на Брэст, Кобрын і Пружаны і дзейнічаць у тыле французкай арміі, Тармасаў загадаў Ламберту і А. Р. Шчарбатаву рухацца на Брэст, а потым павярнуць на Кобрын, куды з Ковеля павінны былі падысці асноўныя сілы 3-й арміі. Каб адцягнуць частку саксонскіх войск ад Кобрына, асобы атрад генерала А. П. Мелісіна павінен быў рухацца да Пінска.

13 (25) ліпеня атрад Шчарбатава заняў Брэст, злучыўся з дывізіяй Ламберта, і раніцай 15 ліпеня яны падышлі да Кобрына. Ламберт зрабіў захады, каб закрыць дарогу для адступлення саксонцаў у напрамку Пружан і Брэста.



Перад Тармасавым стаяла задача вызваліць Кобрын, які раптоўна быў захоплены ворагам. Рускія часці з усіх бакоў адрэзалі ворагу шляхі да адступлення, аднак

той працягваў аказваць супраціўленне. У выніку артылерыйскага абстрэлу ў розных частках горада ўспыхнулі пажары, якія прымусілі салдатаў Кленгеля ўкрыцца за каменнай сцяной Базіліянскага манастыра і ў развалінах старажытнага замка паблізу Мухаўца.

Пасля падыходу перадавога атрада 3-й рускай арміі на чале з Чапліцам пачаўся агульны штурм Кобрына. Акружаны з усіх бакоў Кленгель, страціўшы надзею вырвацца з акружэння, быў вымушаны скласці зброю і капітуляваць.



У выніку 9-гадзіннага бою было забіта каля 2 тысяч саксонцаў, рускія захапілі ў палон 2 генералаў, 76 афіцэраў, 2382 чал. ніжніх чыноў. Страты рускіх склалі 77 чалавек забітымі і 182 параненымі. Трафеямі пераможцаў

сталі 8 гармат і 4 сцягі, з якіх два цяпер знаходзяцца ля магілы М. І. Кутузава ў Казанским саборы ў Ленінградзе.

Маральнае значэнне першай значнай перамогі рускай арміі было велізарным. Кобрынскі бой стаў першай з пачатку вайны перамогай расійскіх войскаў. У выніку супраць арміі Тармасава французы павінны былі трымаць значныя сілы, што адмоўна паўплывала на армію Напалеона ў час яе адступлення ад Масквы.

У гонар гэтай перамогі са сцен Петрапаўлаўскай крэпасці ў Санкт-Пецярбургу быў дадзены першы пераможны салют.

У памяць 100-годдзя Айчыннай вайны 1812 года на




ўзнагародным юбілейным медалі, выпушчаным у жніўні 1912 года па загадзе імператара Мікалая II, напісаны гэтыя словы: «*Славный год сей минул, но не пройдут содеянные в нем подвиги*».

Што ж тычыцца самога горада Кобрына, то ён моцна пацярпеў ад пажару: з 630 двароў ацалела толькі 82, і не адзін год кабрынчане ліквідавалі наступствы сутыкнення двух наймацнейшых армій.

Так невялікае мястэчка Кобрын увайшло ў гісторыю як месца, дзе быў развеяны міф пра неперажнасць французскага войска.

# ЛЁС ГАЛОЎНАГА ПОМНІКА ГОРАДА

Гістарычныя знакавыя падзеі адлюстроўваюць помнікі. Адзін з іх - у гонар перамогі рускай арміі ў Айчыннай вайне 1812 года, што ў цэнтры Кобрына.

… Калі блізіўся стогадовы юбілей Айчыннай вайны, у розных месцах Расіі ўзнікалі камітэты для ўвекавечання найбольш знамянальных баявых падзей. Да збору грашовых сродкаў на збудаванне помніка ў Кобрыне прыцягваліся воінскія часці, продкі салдат, якія прымалі ўдзел у баі 15 (27-ліпеня).



Роўна праз сотню гадоў у ліпені 1912 года ў Кобрыне адбылася ўрачыстая закладка помніка у гонар першай перамогі рускіх войскаў у 1812 годзе побач з саборам, а яшчэ праз год - яго адкрыццё.

Помнік быў створаны на сродкі, сабраныя салдатамі і афіцэрамі частак 38-й пяхотнай дывізіі і 38-й артылерыйскай брыгады, якія дыслацыраваліся ў наваколлі горада, а таксама на ахвяраванні жыхароў Гродзеншчыны і палкоў, якія ўдзельнічалі ў баях.

Аўтар першапачатковага помніка - кобрынскі грамадскі інжынер Д. Маркаў. Ён жа бясплатна кіраваў будаўнічымі работамі і ажыццяўляў аўтарскі нагляд. Камень апрацоўваў брэсцкі майстра Ярасінскі, бронзавага арла і мемарыяльную дошку стварыў вядомы варшаўскі скульптар Зыгмунд Ота.

Першы помнік некалькі адрозніваўся ад таго, які мы бачым сёння. Каменную кампазіцыю на пастаменце завяршаў горды двухгаловы арол з распасцёртымі крыламі як сімвал перамогі і велічы, які кіпцюрамі раздзірае вянок з лацінскай літарай «N».

Адкрыты помнік быў цераз год. 15 ліпеня 1913 года адбылося ўрачыстае адкрыццё выдатнага манумента ў выглядзе гранітнай скалы з бронзавай постаццю двухгаловага арла. Помнік атрымаўся велічным. Перад помнікам, акружаным ланцугом, былі ўсталяваны чатыры марціры перыяду 1812 года. На ўрачыстым адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі войскаў Варшаўскай ваеннай акругі, дэлегацыі іншых воінскіх часцей, мясцовыя ўлады, духавенства і жыхары Гродзенскай губерні.

Але далейшы лёс гэтага манумента трагічна-журботны і нагадвае вострасюжэтны дэтэктыў. У сваім першапачатковым стане помнік праіснаваў толькі да 1915 года.



Пад час Першай сусветнай вайны ён зведаў частковыя разбурэнні. Немцы, якія акупіравалі Кобрын, знялі арла і адправілі на пераплаўленне, таксама былі зняты і мемарыяльныя дошкі. Цудам уцалела толькі асабовая мармуровая пліта, абедзве бакавыя дошкі былі пабіты. У такім выглядзе помнік прастаяў каля 15 гадоў.

Яшчэ праз пяць гадоў польскія ўлады, змяніўшыя германскія, загадалі замест прыбранай фасаднай мемарыяльнай пліты на помніку ўсталяваць бетонную плітку з надпісам па-польску: «*Кобрын адабраны ў маскалёў 13 верасня 1920 года*».

У сярэдзіне 1930-х гадоў адзін з мясцовых шляхцічаў самавольна ўмацаваў на пустым пастаменце невялікі бюсцік Тадэвуша Касцюшкі, які ў хуткім часе быў заменены на большы па памерах. У 1930 годзе на пустуючы пастамент узнялі бюст Тадэвуша Касцюшкі. Выкананы ён быў скульптарам Б. Відацкай, якая жыла ў Кобрыне. Але помнік з бюстам Тадэвуша Касцюшкі прастаяў нядоўга.



22 верасня 1939 года ў Кобрын увайшла Чырвоная Армія. У ходзе сацыялістычных пераўтварэнняў бюст быў зняты з п'едэсталу. Статуя Т. Касцюшкі перададзена ў Брэсцкі абласны краязнаўчы музей (*цяпер гэты бюст усталяваны ў в. Малыя Сяхновічы, што ў Жабінкоўскім раёне, дзе ў радавым маёнтку спачатку ў юным узросце, а потым на схіле гадоў, жыў генерал Тадэвуш Касцюшка*). Безумоўна, несумненным застаецца тое, што такая гістарычная асоба сусветнага маштабу, як Т. Касцюшка, назаўжды застанецца часткай гісторыі Кобрыншчыны.

Напярэдадні 140-годдзя Айчыннай вайны 1812 года па ініцыятыве Аляксея Міхайлавіча Мартынава было вырашана аднавіць першапачатковы выгляд помніка, і ў 1951 годзе ён быў амаль цалкам адноўлены.

Праўда, новы бронзавы арол ужо быў з адной галавой. Менавіта такім ён сустракае кабрынчан і гасцей горада зараз. Постаць арла з вянком выканаў мінскі скульптар М. Керзін. Па замыслу скульптара быў створаны новы варыянт арла з непашкоджаным лаўровым вянком без вензеля Напалеона. Гэты вянок сімвалізуе славу рускай зброі. Дакладнай копіі згубленага арыгінала не атрымалася. І тым не менш, сёння помнік упрыгожвае цэнтральную вуліцу горада і з'яўляецца адным з самых вядомых сімвалаў Кобрына.



Помнік складаецца з пастамента, зробленага з гранітных валуноў, які нагадвае скалу, і ўстаноўленага на ім бронзавага арла з распрасцёртымі крыламі і лаўровым

вянком у кіпцюрах, абапал - марціры з пірамідкамі ядраў. На фасадзе і бакавых гранях пастамента - тры мармуровыя мемарыяльныя дошкі. На пярэдняй дошцы (шэра-зялёнага колеру) – мемарыяльны надпіс «*Рускім воінам, якія атрымалі першую перамогу над войскамі Напалеона ў межах Расіі 15 ліпеня 1812 г.*». На бакавых таблічках (белага колеру) пералічаны палкі, часці рускай арміі, што ўдзельнічалі ў Кобрынскай бітве, узятыя імі трафеі і колькасць палонных, а таксама спонсары, на сродкі якіх збудаваны помнік.

Кампазіцыя помніка вызначаецца яснасцю, пластычнай цэласнасцю архітэктурнай і скульптурнай формы.

У Кобрыне аб падзеях 1812 года дадаткова нагадваюць дзве мемарыяльныя дошкі. Адна ўмацавана на будынку Сабора, збудаванага на брацкай магіле рускіх воінаў-герояў, загінуўшых у Кобрынскім баі. Другая - на будынку Спаскага манастыра, поруч якога складалі зброю да ног пераможцаў войскі генерала Кленгеля.




Бронзавы арол з лаўравым вянком у кіпцюрах і марціры з пірамідкамі ядраў нібыта вяртаюць нас у той час, калі рускія салдаты разам з усім народам змагаліся супраць напалеонаўскай навалы і атрымалі першую

перамогу ў межах Расіі. Зараз ля помніка гуляюць дзеці, фатаграфуюцца маладыя пары, турысты.

Побач - сабор Аляксандра Неўскага, закладзены ў 1864 годзе ў гонар адмены прыгоннага права. Выдатныя формы архітэктуры позняга класіцызму з элементамі рэтраспектыўна-рускага накірунку, на сцяне – мемарыяльная дошка, якая нагадвае нам пра подзвіг воінаў, загінуўшых у 1812 годзе.

У наш час помніку ў гонар перамогі 1812 года нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.



# СПІС КРЫНІЦ

## *Кнігі, раздзелы з кніг*

**Бабенко, Е. В.** Кобрин - первая победа русской армии в Отечественной войне 1812 года / Е. В. Бабенко // Война и оружие: новые исследования и материалы. Труды Третьей международной научно-практической конференции. 16-18 мая 2012. - Часть I. - Спб., 2012. - С. 32-44.

**Бекцінееў,** Ш. І. Кобрынскі бой 1812 / Ш. І. Бекцінееў, В. В. Швед // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. - С. 369-370.

**Бекцінееў, Ш.** Кобрынскі бой 1812 / Шаміль Бекцінееў, Вячаслаў Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т.– Мінск, 1997. – Т. 4. - С. 219.

**Бекцінееў, Ш. І.** Першая перамога / Ш. І. Бекцінееў, В. В. Швед // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 63-64.

Кобрынскі бой 1812 года.

**Бой** з французскімі захопнікамі каля Кобрына // Гісторыя БССР : дапаможнік / Абецадарскі, Л. С. - Мінск, 1967. - С. 70.

**Ерошевич, А. В.** Кобринский бой 1812 / А. В. Ерошевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] - Минск, 2007. - Т. 4. - С. 99.

**Кисель, В. П.** Памятники, посвященные событиям 1812 г. на землях Беларуси / В. П. Кисель // Памятники истории и культуры Республики Беларусь / В. П. Кисель. - Минск, 2011. - С. 160.

**Кобринская** битва 1812 // Брест : энциклопедический справочник. - Минск, 1987. - С. 233-234.

**Кобринский** бой // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : [в 5 т.] / ред. кол.: П. У. Бровка [и др.]. - Минск, 1979. - Т. 1. - С. 297-298 : фот.

**Кобрынскі** бой 1812 г. // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. - Мінск, 2010. – С. 525.

**Курков, И.** Дорога в прошлое / И. Курков // Брестчина : Легенды, события, люди / И. Курков. - Минск, 2005. - С. 101-103.

Война 1812 г. на Кобринщине, есть фото памятника в честь победы под Кобрином в 1812 г.

**Лупинович, И. С.** Памятник русской славы / И. С. Лупинович // По Белорусскому Полесью (географические очерки) / И. С. Лупинович. - Минск, 1958. - С. 50-53.

**Мартынов, А. М.** Памятник Победы / А. М. Мартынов // Свод памятников истории и культуры Белорусии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 249-250.

**Мартынаў, А. М.** Помнік Перамогі 1812 г. / А. М. Мартынаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 225, 226.

**Мемориальная** доска в честь Победы русских войск в 1812 г. // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. - Минск, 1990. - С. 248.

**Па мясцінах** ратнай славы = По местам ратной славы. – Мінск, 1983. – С. 22, 23 : фота.

**Памятные** места Брестчины. - Минск, 1970.

Среди памятных мест - памятник в честь победы русских войск 1812 г. в Кобрине.

**Памяць** зямлі Беларускай. - Мінск, 1979.- 208 с.

Упамінаецца помнік рускім воінам, атрымаўшым першую перамогу ў Айчыннай вайне 1812 г.

**Пирожник, И. И.** Воинской славой овеяны / И. И. Пирожник // Дорогами дружбы: Белорусское и Украинское Полесье / И. И. Пирожник. - Минск, 1985. - С. 65-66.

События Отечественной войны 1812 г. под Кобрином.

[**Помнік воінам** Айчыннай вайны 1812 года у Кобрыне] // Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Мінск, 1989. – Т. 3. Канец 18 - пачатак 20 стагоддзя. - С. 205, 206, 231.

**Помнікі** гісторыі 1812 года *//* Гісторыка-культурная спадчына Кобрыншчыны *I* аддзел культуры Кобрынскага райвыканкама ; склад. Ю. А. Барысюк. – Баранавічы, 2001. – С. 14-15 : фота.

**Садоўскі, Я.** Айчынная вайна 1812 года / Яфім Садоўскі // Гістарычныя помнікі Беларусі / Яфім Садоўскі. – Мінск, 1958. – С. 10, 11 : фота.

Помнік у гонар перамогі 1812 г. у г. Кобрыне.

**Чернатов, В. И.** Памятник в честь победы русских войск в войне 1812 г. / В. И. Чернатов // Памятники воинской славы на белорусской земле (XIX - нач. XX вв.) / В. И. Чернатов. - Минск, 1976. - С. 25-28.

## *Часопісныя і газетныя артыкулы*

**Рысь, А**. Гэта наша гісторыя / [Алена Рысь ; запісала] Н. Ніжнік // Кобрынскі веснік. – 2015. – 18 ліпеня. – С. 4.

Супрацоўнік ваенна-гістарычнага музея А. Рысь – пра гісторыю сабора А. Неўскага і помніка героям вайны 1812 года.

**Хокимова, А.** Пьедестал для мятежного генерала / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2013. – 6 февраля. – С. 6.

О памятниках Т. Касцюшко.

**Рысь, Е.** И славы гром в честь Кобрина увековечен ныне... : к 100-летию открытия памятника в честь кобринской победы 15 июля 1812 года / Елена Рысь // Кобрынскі веснік. - 2013. – 13 ліпеня, 17 ліпеня.

**Борисюк, Ю.** Судьба одного памятника в Кобрине / Юрий Борисюк // Туризм и отдых. - 2012. - 13 декабря.

**Котковец, А.** Сражениями прожженная земля / Алла Котковец // Заря. - 2012. - 21 апреля. - С. 7.

**Ночь** музеев в Кобрине // Кобрин-информ. - 2012. - 11 мая. - С. 6.

Тема мероприятия - 200-летие войны 1812 года.

**1812 год** у гісторыі Беларусі : бібліяграфічны спіс крыніц да 200-годдзя з пачатку вайны 1812 года // Новыя кнігі. - 2012. - № 5. - С. 1-16 (дадатак).

**Амитофов, А.** Уйти по-французски, или как Наполеона в Беларуси чуть не пленили : к 200-летию войны 1812 года / Александр Амитофов // Заря. - 2011. - 31 декабря. - С. 7.

**Календарь** знаменательных и памятных дат Брестской области на 2012 год : 200 лет назад (1812) под Кобрином произошла битва 3-й русской армии под руководством генерала Тормасова с французскими войсками // Заря. -2011. - 31 декабря. - С. 5.

**Козлович, В.** Память в два столетия / Валентина Козлович // Советская Белоруссия. – 2010. – 29 июля. – С. VI. – (Союз Беларусь – Россия).

Из истории памятника героям войны 1812 года.

**Мартынов, А.** Непростая судьба главного памятника города : исторические памятники Кобринщины // Кобрин-информ. - 2010. – 16 сентября. – С. 6.

**Цімчанка, І.** Ізмаіл ягонага лёсу / Ігар Цімчанка // Маладосць. - 2010. - № 2. - С. 124-133.

Нарыс пра расійскага ваеннага дзеяча, удзельніка вызвалення Кобрына, Пінска, Брэста ў Айчынную вайну 1812 г. І. К. Сакалоўскага.

**Бялоў, Д.** Подых далёкай гісторыі / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2009. – 17 верасня. – С. 3.

Пра помнік рускім воінам у Кобрыне, атрымаўшым першую перамогу над войскамі Напалеона ў межах Расіі ў Айчыннай вайне 1812 года.

**Мартынов, А.** Войны в истории Кобринщины / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 12 февраля, 12 марта.

**Мартынов, А. М.** Помнит Брестчина 1812 г. : история / А. М. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 14 мая. – С. 26.

В Кобрине о событиях 1812 г. напоминают две мемориальные доски, памятник.

**Адамянц-Подъяков, В.** Кобринское поражение Наполеона / Валерий Адамянц-Подъяков // Заря. - 2008. - 23 августа. - С. 12.

**Марчук, Н.** Наполеоновская эпопея Кобринщины : взгляд сквозь годы / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2007. - 20 декабря. - С. 7.

**Фридлендер, Н.** Помнили, помним и будем помнить… / Наталья Фридлендер // Кобрин-информ. - 2007. - 12 июля. – С. 3.

**Шевченко, А.** Историческая справедливость восстановлена / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. – 5 июля.

О судьбе бюста Т. Костюшко.

**Пустовой, Е.** Сберечь нашу память / Евгений Пустовой // Кобрин-информ. – 2005. – 21 апреля.

**Панасюк, М.** Святыні вяртаюцца / М. Панасюк // Беларуская думка. - 2003. - № 2. - С. 31-38.

Упамінаецца бой пад Кобрынам 1812 г.

**Мартынов, А.** «…Припомним, как билися деды в двенадцатый памятный год» / Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2002. – 3 жніўня.

**Ивановский, В.** Два лица одного памятника / Витольд Ивановский // Голос Немана. – 1999. – 16 апреля.

**Маліноўскі, М. М.** Ішоў Напалеон праз Беларусь / М. М. Маліноўскі // Чырвоная змена. - 1994. - 10 сакавіка.

**Ильенков, В.** Полесье. 1812 год / В. Ильенков // Пінскі веснік. - 1992. - 22 ліпеня.

К 180-летию Отечественной войны 1812 года.

**Нестерчук, Л.** Под стягами славы / Л. Нестерчук // Заря. - 1990. - 14 февраля.

**Мартынов, А.** Во славу русского оружия : к 175-летию Отечественной войны 1812 года / А. Мартынов // Заря. – 1987. – 6 августа.

**Мартынаў, А.** Войны ў гісторыі нашага горада / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 26 лютага, 7 сакавіка, 10 сакавіка.

**Мартынаў, А.** Дванаццаты памятны год : да 175-гадавіны Айчыннай вайны 1812 года / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 30 ліпеня.

**Помнік** у гонар перамогі ў Айчыннай вайне 1812 года ў Кобрыне // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. - 1982. - № 2. - С. 24.

**Мартынов, А.** Обелиск русской славы / Алексей Мартынов // Заря над Бугом. - 1972. – 12 сентября.

**Памятник** в Кобрине // Советская Белоруссия. - 1968. - 22 августа.

**Помнік** у г. Кобрыне, прысвечаны першай перамозе рускіх войск над войскамі Напалеона ў 1812 г. // Камуністычная праца. - 1967. - 24 чэрвеня.

**Памятник** в честь победы русских войск над войсками Наполеона в войне 1812 г. в Кобрине : фотаздымак // Советская Белоруссия. - 1965. - 1 августа.

**Кривенко, Н.** Лавры первой победы. Памятный 1812-й год / Н. Кривенко // Советская культура. - 1962. - 28 августа.

**Мартынов, А.** Двенадцатый памятный год / А. Мартынов // Знамя юности. - 1962. - 3 августа.

**Мартынаў, А.** Помнік у гонар першай перамогі ў 1812 годзе / А. Мартынаў // Камуністычная праца. - 1962. - 26 ліпеня.

**Мартынов, А.** Сооружён потомками героев / Алексей Мартынов // Советская Белоруссия. - 1962. - 27 июля.

О памятнике героям войны 1812 г.

**Мартынаў, А.** Помнік рускай воінскай славы / А. Мартынаў // Маладосць. - 1954. - № 7. - С. 11.

**Мемориальные** доски на кобринском памятнике в честь победы 1812 г. // Заря. - 1954. - 9 мая.

**Мартынов, А.** Кобринский бой в 1812 г. / Алексей Мартынов // Советская Белоруссия. - 1952. - 26 июля.

**Мартынов, А**. Кобринский бой в 1812 г. / Алексей Мартынов // Заря. - 1952. - 26 июля.

**Воінскай** славай авеяны : бібліяграфічны паказальнік / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын, 2012. – 20 с.

# ЗМЕСТ


**Прадмова** 3

Дванаццаты памятны год: кобрынскі бой 4

Лёс галоўнага помніка горада 8

**Спіс крыніц** 15

*Кнігі, раздзелы з кніг* 15

*Часопісныя і газетныя артыкулы* 18

# Помнік рускай славы
## Лёс галоўнага помніка горада

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіча

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by